УСТАНОВА "БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА"

# ДОРСКІ ІОСІФ ЛЬВОВІЧ

**ДРАМАТУРГ**

**4 (17) СНЕЖНЯ 1911 Г. – 7 СНЕЖНЯ 1964 Г.**

# БЯЛІНСКАЯ МАРЫЯ СЯРГЕЕЎНА (ЖОНКА)

**АКТРЫСА, НАРОДНАЯ АРТЫСТКА БССР**

**22 ЛІПЕНЯ 1906 Г. – 3 МАЯ 1990 Г.**

**ФОНД № 286**

**ВОПІС № 1**

**1922 г. – [1980-я гг.]**

МІНСК 2019

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 286**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ І.Л. ДОРСКАГА | 1-15 | 1-2 |
| 1.1. | РУКАПІСЫ І.Л. ДОРСКАГА | 1-6 | 1 |
| 1.2. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.Л. ДОРСКАГА | 7-15 | 1-2 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ М.С. БЯЛІНСКАЙ | 16-30 | 2-4 |
| 2.1. | ФАТАГРАФІІ М.С. БЯЛІНСКАЙ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ТЭАТРА ІМЯ Я. КОЛАСА, ТЭАТРА ІМЯ Я. КУПАЛЫ | 16-28 | 2-4 |
| 2.2. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ М.С. БЯЛІНСКАЙ | 29-30 | 4 |

# Прадмова

**Дорскі Іосіф Львовіч** нарадзіўся 4 (17) снежня 1911 г. у Мінску у сям'і служачага. З 1920 г. па 1927 г. вучыўся ў 5-й мінскай сярэдняй школе. З 1927 г. да 1929 г. вучыўся на 1-х мінскіх агульнаадукацыйных курсах. З канца 1929 г. да 1930 г. вучыўся на курсах кінасцэнарыстаў у Мінску. Працаваў сакратаром рэдакцыі шматтыражнай газеты пры заводзе імя Молатава (1929-1930), на кінафабрыцы "Савецкая Беларусь" у Ленінградзе (1930-1932), літсупрацоўнікам у газеце "Рабочий" у Мінску (1932-1934). У 1934 г. быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў загадчыкам літаратурнай часткі БДТ-1 (тэатр імя Я. Коласа) (1935-1944). З 1939 г. да 1941 г. вучыўся на завочным аддзяленні Літаратурнага інстытута імя А.М. Горкага (Масква). Працаваў намеснікам дырэктара тэатра імя Я. Коласа (1944-1948), дырэктарам тэатра імя Я. Коласа (1948-1960), дырэктарам кінастудыі "Беларусьфільм" (1961-1964).

Член СП БССР з 1956 г., дэпутат Віцебскага гарадскога савета дэпутатаў працоўных 51 выбарчай акругі (1959), член КПСС (з 1945).

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1961).

Узнагароджаны: Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1946), медалём "За доблестный труд в Великой Отечественной войне" (1946), ордэнам "Знак почета" (1949).

Упершыню выступіў у друку ў 1928 г. з рэцэнзіяй у часопісе "Чырвоны сейбіт". З гэтага часу пачаў друкаваць рэцэнзіі з тэатральнай крытыкай, нарысы, напісаў "Нарыс гісторыі тэатра імя Я. Коласа" (1956). Аўтар п'ес: "Цэнтральны ход" (у сааўт. з К.Л. Губарэвічам, паст. тэатрам імя Я. Коласа ў 1948 г.), "Алазанская даліна" (у сааўт. з К.Л. Губарэвічам, паст. тэатрам імя Я. Коласа ў 1949 г. і Палескім абласным драматычным тэатрам у 1950 г.), "Право на счастье" (паст. Дзяржаўным рускім драматычным тэатрам БССР імя М. Горкага ў1956 г., тэатрам імя Я. Коласа - пад назвай "Шчасце"),

Памёр І.Л. Дорскі 7 снежня 1964 г. Пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках.

**Бялінская Марыя Сяргееўна** нарадзілася 22 ліпеня 1906 г. у Магілёве ў рабочай сям'і. З 1914 г. да 1920 г. вучылася ў прыхадской школе. Працавала ў Магілёве: перапісчыцай ў рэвваенсавеце 16-й арміі (1921-1922) і тэлефаністкай у Чырвоным універсітэце (1922-1923), вучылася на курсах памочніка бібліятэкара (1923-1924). У 1924-1926 гг. вучылася ў Беларускай драмстудыі ў Маскве. У

1926-1964 гг. працавала ў тэатры імя Я. Коласа.  У час Вялікай Айчыннай вайны, разам з супрацоўнікамі тэатра імя Я. Коласа, была эвакуіравана ў Уральск (Арэхава-Зуева). У 1944 г. была ў складзе франтавой тэатральнай брыгады, якая выступала з канцэртнымі праграмамі ў шпіталях і на прадпрыемствах. Вядомыя акцёрскія работы ў тэатры імя Я. Коласа: Марына (“Вайна вайне” Я. Коласа) (1937), Таццяна Марыч (“Над Бярозай-ракой” П.Ф. Глебкі) (1940), Люсінда (“Лекар паняволі” Мальера) (1941), Жаніна (“Забаўны выпадак” К. Гальдоні) (1942), Марыя Антонаўна (“Рэвізор” М.В. Гоголя) (1945), Афелія (“Гамлет” У. Шэкспіра) (1946), Даша (“Нараджэнне свету” паводле А.М. Талстога) (1948), Старшыня калгаса (“Алазанская даліна” К.Л. Губарэвіча, І.Л. Дорскага) (1949), Марыя Аляксандраўна (“Сям’я” І.С. Папова) (1950), Ліза Пратасава (“Жывы труп” Л.М. Талстога) (1951). У тэатры імя Я. Купалы працавала ў 1965-1979 гг. Вядомыя акцёрскія работы ў тэатры Я. Купалы: Настасся Пятроўна (“Жаніцьба Бялугіна” А.М. Астроўскага і М. Салаўёва) (1965), Зіначка (“У мяцеліцу” Л.М. Лявонава) (1965), Глушачыха (”Людзі на балоце” паводле І.П. Мележа) (1966), Кандраціха (“Рудабельская рэспубліка” паводле С.І. Грахоўскага) (1968), Раіса Фёдараўна (“Дзесяць сутак за каханне” У.К. Канстанцінава і Б.М. Рацэра) (1969), Галчыха (“Без віны вінаватыя” А.М. Астроўскага) (1971), маці Віктара (“Гульня з кошкай” І. Эркеня) (1976).

Член КПСС з 1947 г. Заслужаная артыстка БССР (1940), народная артыстка БССР (1953).

Узнагароджана: медалямі - “За трудовое отличие” (за поспехі ў галіне савецкага мастацтва, 1940), “За доблестный труд” (за поспехі ў галіне савецкага мастацтва, 1944), Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1952, 1953, 1960), ордэнам “Знак Почёта” (1955).

Памерла М.С. Бялінская 3 мая 1990 г. Пахавана ў Мінску на Усходніх могілках.

Дакументы сямейнага архіва І.Л. Дорскага і М.С. Бялінскай паступілі ў БДАМЛМ ад Марыі Сяргееўны Бялінскай у 1984 г. [*] У выніку навуковага апісання быў створаны вопіс № 1, сфарміравана 30 спраў (57 дак.) за 1922 – 1980-я гг.

---

[*] Гл. таксама: Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 8 – 156 адз.зах. за 1924-1990 гг. “Белинская Мария Сергеевна – народная артистка БССР, Дорский Иосиф Львович – её муж, театральный деятель, драматург, заслуженный деятель искусств БССР”

Вопіс складаецца з  2-х раздзелаў: “Дакументы І.Л. Дорскага”, “Дакументы М.С. Бялінскай” справы ў якіх сістэматызаваны па храналагічным прынцыпе.

Прадмову склала
вяд. архівіст Н.П. Прынько
2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ І.Л. ДОРСКАГА** | | | | |
| | **1.1. РУКАПІСЫ І.Л. ДОРСКАГА** | | | | |
| 1 | "Право на счастье" = "Золотая клетка". П'еса.<br>Чарнавы аўтограф | 1955 | 115 | 1 | |
| 2 | "Право на счастье" = "Золотая клетка". П'еса.<br>Варыянт. Без канца.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1955 | 115 | 1 | |
| 3 | "Право на счастье" = "Золотая клетка". П'еса.<br>Варыянты. Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф, асобныя лісты | 1955 | 73 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Я. Коласа". Кароткі нарыс.<br>Машынапіс, асобныя лісты | 1946 | 80 | 1 | |
| 5 | "Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа". Кароткі нарыс.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з праўкай | [1950-я гг.] | 118 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 6 | Праграма спектакля Вялікалукскага драматычнага тэатра па п'есе І.Л. Дорскага "Право на счастье" (рэж. І.А. Фамікаў) | 1958 | 2 | 1 | |
| | **1.2. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.Л. ДОРСКАГА** | | | | |
| 7 | Фатаграфіі І.Л. Дорскага, індывідуальныя | 1950-я гг, 1960-я гг. | 2 | 2 | |
| 8 | Фатаграфія С.Л. Дорскага (брата), індывідуальная.<br>Фота А. Каляды | [1980-я гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 9 | Фатаграфіі І.Л. Дорскага з М.С. Бялінскай (жонкай), А.І. Лагоўскай, І.А. Матусевічам, М.П. Маркоўскай і інш. у час Дэкады літаратуры і мастацтва ў Маскве і інш. | [1935], 1955 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 10 | Фатаграфія І.Л. Дорскага з У.Е. Лабанком, Ю.Б. Шчарбаковым. З дароўным надпісам Ю.Б. Шчарбакова І.Л. Дорскаму ад верасня 1959 г. | 1959 | 1 | 1 | |
| 11 | Фатаграфіі І.Л. Дорскага з К. Крапівой, В. Палескім, Г.А. Стрыжэнавым і інш. | [1950-я гг. - пач. 1960-х гг.] | 3 | 3 | |
| 12 | Фатаграфіі І.Л. Дорскага з У.Е. Лабанком, В.І. Казловым, А.І. Мікаянам, А.М. Пахмутавай, М.С. Хрушчовым і інш. у час уручэння граматы "Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР", сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва | 1962 | 2 | 2 | |
| 13 | Фатаграфіі І.Л. Дорскага з неўстаноўленай асобай ў час здымак мастацкага фільма "Пущик едет в Прагу" ("Беларусьфільм", "Барандов"). Прага | [1964] | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Цэнтральны ход", пастаўленага рэж. Б.Ш. Мардуховічам і М.І. Міцкевічам па п'есе І.Л. Дорскага і К. Губарэвіча з удзелам З.С. Вялікага (у ролі Вашкевіча), С.А. Казлова (у ролі Салаўёва), І.А. Матусевіча (у ролі камenданта станцыі Орша), А.П. Радзялоўскай і інш. | 1948 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 15 | Газета "Правда": № 244 за 13 кастрычніка 1946 г., № 338 за 4 снежня 1954 г. | | 4 | 2 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ М.С. БЯЛІНСКАЙ** | | | | |
| | **2.1. ФАТАГРАФІІ М.С. БЯЛІНСКАЙ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ТЭАТРА ІМЯ Я. КОЛАСА, ТЭАТРА ІМЯ Я. КУПАЛЫ** | | | | |
| 16 | Фатаграфіі М.С. Бялінскай у ролях у спектаклях тэатра імя Я. Коласа: Марыі Міхайлаўны Платонавай "Адна" С.А. Алёшына (рэж. А.Б. Скібнеўскі), Юнгі "Гібель эскадры" А.Я. Карнейчука (рэж. К. Зубаў), "Дачка пракурора" Ю.І. Янкоўскага (рэж. М.А. Міцкевіч, А.Б. Скібнеўскі), "Чалавек вырашае" Дз. Курдзіна (рэж. В.А. Дарвішаў). Копіі | 1934, 1935, 1954, 1957 | 4 | 4 | |
| 17 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Сентыментальны вальс", пастаўленага рэж. Н.Б. Лойтарам па п'есе А.С. Літоўскага, з удзелам М.Я. | 1941 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Бялінскай (у ролі Наталлі), Л.І. Мазалеўскай, А.Р. Шэлега (у ролі Мельгунова) | | | | |
| 18 | Фатаграфіі М.С. Бялінскай у ролі Джэсі з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Рускае пытанне", пастаўленага рэж. П.С. Малчанавым па п'есе К.М. Сіманава, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам М.С. Бялінскай, П.С. Малчанава (у ролі Сміта) | 1947 | 2 | 2 | |
| 19 | Фатаграфіі М.С. Бялінскай у ролі Грэты Норман з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Свежы вецер" В.М. Сабко, пастаўленага рэжысёрам А.Б. Скібнеўскім, і сцэн з гэтага спектакля з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі Грэты Норман), І.Г. Ганусевіча (у ролі Клаўса Найдорфа), А.П. Радзялоўскай (у ролі маёра Славінай), Е.М. Разанавай (у ролі Кальцовай), А.М. Труса (у ролі маёра Славіна), Ф.І. Шмакава (у ролі сяржанта Каваленкі) | 1950 | 4 | 4 | |
| 20 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Сям'я", пастаўленага рэж. А.Б. Скібнеўскім па п'есе І.С. Папова, з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі Марыі Аляксандраўны), А.К. Ільінскага (у ролі Кузьмы Іванавіча), Ф.І. Шмакава (у ролі У. Ульянава) | 1950 | 2 | 2 | |
| 21 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Разлом", пастаўленага рэж. М.А. Міцкевічам па п'есе Б.А. Лаўрэнёва, з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі Таццяны), Б.М. Левіна (у ролі Штубэ), Я.К. Глебаўскай (у ролі жонкі Бярсенева), Б.М. Левіна, А.Р. Шэлега (у ролі Гадуна).<br>Арыгінал, копія | 1951 | 2 | 2 | |
| 22 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Капітан Коршун", пастаўленага рэж. Н.Б. Лойтарам па п'есе В.М. Сабко, з удзелам М.С. Бялінскай, Л.І. Лічыніцэр (у ролі Таццяны).<br>Копія | 1954 | 1 | 1 | |
| 23 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Тайфун", пастаўленага рэж. В. Броўкіным па п'есе Цао Юй, з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі Шы-Пін), Ц.М. Сяргейчыка (у ролі Чжоў-Пу) | 1958 | 1 | 1 | |
| 24 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Якарная плошча", пастаўленага рэж. Б. Браганцавым па п'есе І. Штока, з удзелам М.С. Бялінскай, М.Л. Федароўскага | 1960 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 25 | Фатаграфіі М.С. Бялінскай у ролях з спектакляў тэатра імя Я. Коласа: Клаўдзіі Уладзіміраўны "Жыве на свеце жанчына" З. Аграненкі (рэж. І. Папоў), Клаўдзіі Пятроўны "Ленінградскі праспект" І. Штока (рэж. Ю. Собалеў), Гольды "Тэўе-малочнік" Шолама-Алейхема (рэж. Ф. Партноў) | 1962, 1963 | 3 | 3 | |
| 26 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Вендэта", пастаўленага рэж. В. Мкртумам па п'есе М.Г. Віннікава, з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі Акімаўны), Я.К. Глебаўскай (у ролі Антаніны Пятроўны), М.Г. Шэлутко (у ролі Сяргея) | 1964 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 27 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Купалы "Без віны вінаватыя", пастаўленага рэж. Л.Р. Рахленкам па п'есе А.М. Астроўскага, з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі Галчыхі), Т.Н. Аляксеевай (у ролі Кучынскай Алены Іванаўны) | 1971 | 1 | 1 | |
| 28 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Купалы "Гульня з кошкай", пастаўленага рэж. Б.У. Эрынам па п'есе І. Эркеня, з удзелам М.С. Бялінскай (у ролі маці Віктара), З.І. Браварскай (у ролі Эржы) | 1976 | 1 | 1 | |
| | **2.2. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ М.С. БЯЛІНСКАЙ** | | | | |
| 29 | Фатаграфіі М.С. Бялінскай, індывідуальныя. Копіі | 1922, 1966, [1970-я гг.] | 3 | 3 | |
| 30 | Фатаграфіі М.С. Бялінскай з Я.К. Глебаўскай, З.І. Канапелькай, А.І. Лагоўскай, А. Парнасісам, І.П. Шамякіным і інш. | [1950-я гг.]-1961 | 4 | 4 | |

У дадзены вопіс унесена 30 (трыццаць)

спраў з № 1 па № 30 , 57 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.